Ф 06-006

Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
Установа адукацыі
«Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт
імя Янкі Купалы»
(ГрДУ імя Янкі Купалы)

Министерство образования Республики Беларусь
Учреждение образования
«Гродненский государственный университет
имени Янки Купалы»
(ГрГУ им. Янки Купалы)

РАСПАРАДДЖЭННЕ

РАСПОРЯЖЕНИЕ

25.03.2025 № 149-АХР

г.Гродна

г.Гродно

Аб правядзенні конкурсу эсэ
"Вялікая Айчынная вайна ў лёсе маёй сям'і"

З мэтаю захавання гістарычнай памяці, развіцця духоўнага, інтэлектуальнага і творчага патэнцыялу студэнцкай моладзі і на аснове Плана мерапрыемстваў, прысвечаных святкаванню 80-й гадавіны Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне (загад №221-АХР ад 17.03.2025), плана працы навуковай бібліятэкі на 2025 год

**АБАВЯЗВАЮ:**

1. Навуковай бібліятэцы (М.У.Грынько) арганізаваць і правесці ў перыяд з 01.04.2025 па 08.05.2025 конкурс эсэ "Вялікая Айчынная вайна ў лёсе маёй сям'і" (далей – конкурс).
2. Зацвердзіць Палажэнне аб правядзенні конкурсу (прыкладаецца).
3. Зацвердзіць склад арганізацыйнага камітэта конкурсу (прыкладаецца).
4. Зацвердзіць склад журы конкурсу (прыкладаецца).
5. Бухгалтэрыі правесці фінансаванне згодна каштарыса (прыкладаецца).
6. Дэканам (начальніку) факультэтаў, дырэктарам каледжаў забяспечыць удзел студэнтаў (курсантаў), магістрантаў, навучэнцаў у конкурсе.

Прарэктар па навуковай працы Н.З.Башун

ГОУПП «ЛТ», 2023, з. 3243, т. 2000, в4.

ЗАЦВЕРДЖАНА
распараджэннем прарэктара
па навуковай працы
№149-НИ ад "25" *сакавіка* 2025 г.

**Палажэнне аб правядзенні конкурсу эсэ "Вялікая Айчынная вайна ў лёсе маёй сям'і"**

## 1. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1.1. Дадзенае палажэнне вызначае парадак і ўмовы правядзення конкурсу эсэ "Вялікая Айчынная вайна ў лёсе маёй сям'і" (далей – Конкурс) ва ўстанове адукацыі "Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы" (далей – Універсітэт) у межах Плана мерапрыемстваў, прысвечаных святкаванню 80-й гадавіны Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне, плана працы навуковай бібліятэкі на 2025 год.

1.2. Заснавальнікам і арганізатарам Конкурсу з'яўляецца навуковая бібліятэка Універсітэта.

1.3. Непасрэдную арганізацыю і правядзенне Конкурсу ажыццяўляе аргкамітэт.

## 2. МЭТА І ЗАДАЧЫ КОНКУРСУ

2.1. Асноўная мэта Конкурсу – паглыбленне разумення значэння Вялікай Айчыннай вайны ў гісторыі і культуры Беларусі сярод студэнцкай моладзі, захаванне памяці аб героях вайны праз асабістыя гісторыі і сведчанні.

2.2. Падтрымка даследаванняў сямейных архіваў і гісторый, звязаных з удзелам сваякоў у вайне.

2.3. Фарміраванне ў моладзі павагі і ўдзячнасці да ветэранаў і ўдзельнікаў вайны праз асабістыя гісторыі.

2.4. Выхаванне духоўных каштоўнасцей, любові і павагі да мінулага сваёй краіны.

## 3. ТЭРМІНЫ ПРАВЯДЗЕННЯ КОНКУРСУ

3.1. Конкурс праводзіцца на базе Універсітэта ў межах Плана мерапрыемстваў, прысвечаных святкаванню 80-й гадавіны Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне, плана працы навуковай бібліятэкі на 2025 год.

3.2. Конкурс праводзіцца ў перыяд з 01.04.2025 па 08.05.2025.

3.3. У перыяд з 28.03.2025 па 31.03.2025 размяшчаецца інфармацыя аб правядзенні конкурсу, аб умовах удзелу ў Конкурсе.

3.4. Да 30.04.2025 аргкамітэт прымае матэрыялы ўдзельнікаў конкурсу.

3.5. Да 07.05.2025 журы ацэньвае дасланыя на імя аргкамітэта працы.

3.6. 08.05.2025 падводзяцца вынікі Конкурсу, узнагароджваюцца пераможцы.

## 4. УДЗЕЛЬНІКІ КОНКУРСУ

4.1. Удзельнікамі Конкурсу з'яўляюцца студэнты, курсанты, магістранты ўніверсітэта, навучэнцы каледжаў.

## 5. УМОВЫ І ПАРАДАК ПРАВЯДЗЕННЯ КОНКУРСУ

5.1. Асновай да ўдзелу ў Конкурсе з'яўляецца заяўка, у якой указваюцца: прозвішча, імя, імя па бацьку ўдзельніка, дата нараджэння, факультэт (каледж), спецыяльнасць, курс, група, тэлефон, электронная пошта, назва працы (эсэ). Да заяўкі прыкладаецца тэкст эсэ. Усе матэрыялы неабходна прадставіць у папяровым або электронным выглядзе.

5.2. Заяўкі і матэрыялы да ўдзелу ў конкурсе дасылаюцца ў аргкамітэт да 27.04.2025 па адрасе: 230023, г. Гродна, вул. Ажэшкі, 22, каб. 116. Тэл. (80152) 731924, e-mail: library@grsu.by

5.3. Крытэрыямі ацэнкі дасланых прац з'яўляюцца:

5.3.1. раскрыццё зместу і тэмы,

5.3.2. гістарычны кантэкст,

5.3.3. асабістае ўспрыманне аўтара і значнасць падзей для яго сям'і,

5.3.4. лагічнасць пабудовы эсэ,

5.3.5. узровень літаратурнага майстэрства, выразнасць мовы,

5.3.6. здольнасць аўтара перадаць пачуцці і перажыванні, звязаныя з тэмай,

5.3.7. унікальнасць падыходу да тэмы і індывідуальнасць эсэ,

5.3.8. вобразнасць (прыгажосць фраз, крылатыя выразы, параўнанні, эпітэты, лексічнае багацце, адзінства стылю),

5.3.9. граматнасць (адсутнасць арфаграфічных, граматычных, пунктуацыйных, маўленчых памылак),

5.3.10. пазбяганне клішэ і стандартных фармуліровак.

## 6. АРГКАМІТЭТ І ЖУРЫ КОНКУРСУ

6.1. Галоўным кіруючым органам з'яўляецца аргкамітэт, які зацвярджаецца распараджэннем прарэктара па навуковай працы.

6.2. Аргкамітэт забяспечвае арганізацыйна-прававое і інфармацыйна-метадычнае забеспячэнне Конкурсу, арганізуе яго правядзенне, рыхтуе

неабходныя метадычныя матэрыялы і дакументы, вызначае крытэрыі ацэнкі конкурсных прац, устанаўлівае парадак і праводзіць рэгістрацыю атрыманых прац.

6.3. Журы конкурсу зацвярджаецца распараджэннем прарэктара па навуковай працы. Да працы ў складзе журы запрашаюцца спецыялісты ў галіне філалогіі, камунікацыі, выхаваўчай працы.

6.4. Журы ажыццяўляе ацэнку выканання конкурсных прац па крытэрыях, вызначаных аргкамітэтам.

6.5. Праца аргкамітэта і журы ажыццяўляецца на грамадскіх пачатках.

## 7. ПАРАДАК ВЫЗНАЧЭННЯ ПЕРАМОЖЦАЎ КОНКУРСУ І ІХ УЗНАГАРОДЖАННЕ

7.1. Пераможцаў Конкурсу вызначае журы.

7.2. Ацэнкі ўдзельнікаў Конкурсу заносяцца кожным членам журы ў спецыяльны бланк і перадаюцца падліковай камісіі.

7.3. Пераможцы Конкурсу вызначаюцца па суме набраных балаў. У выпадку роўнай колькасці балаў пераможцу вызначае старшыня журы.

7.4. Па выніках Конкурсу вызначаюцца пераможцы (1, 2, 3 месца).

7.5. Па рашэнні журы і аргкамітэта могуць вызначацца дадатковыя намінацыі.

7.6. Пераможцы і прызёры Конкурсу ўзнагароджваюцца дыпломамі і памятнымі падарункамі заснавальнікаў Конкурсу.

7.7. Інфармацыя аб ходзе правядзення Конкурсу і яго пераможцах асвятляецца ў друкаваных і электронных карпаратыўных сродках масавай інфармацыі.

## 8. ІНТЭЛЕКТУАЛЬНАЯ ЎЛАСНАСЦЬ

Правы на выкарыстанне і распаўсюджванне матэрыялаў Конкурсу (з указаннем аўтарства) будуць належаць установе адукацыі "Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы".

Падаўшы свае работы для ўдзелу ў Конкурсе, удзельнік пацвярджае сваю згоду з тым, што арганізатар Конкурсу мае права выкарыстоўваць матэрыялы яго работы шляхам апублікавання і давядзення да ўсеагульнага ведама ў адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

Удзел у Конкурсе падразумявае, што ўдзельнікі выказваюць сваю безумоўную згоду з тым, што іх імёны, прозвішчы і матэрыялы з іх выявай могуць быць выкарыстаны арганізатарам Конкурсу ў рэкламных і іншых мэтах на працягу неабмежаванага тэрміну і без выплаты якіх-небудзь узнагарод.

## 9. ФІНАНСАВАННЕ КОНКУРСУ

9.1. Фінансаванне Конкурсу праводзіцца ў адпаведнасці з зацверджаным каштарысам.

## 10. КАНТАКТНАЯ ІНФАРМАЦЫЯ

230023, г. Гродна, вул. Ажэшкі, 22, каб. 116. Тэл. (80152) 731924, e-mail: library@grsu.by

Дырэктар навуковай бібліятэкі М.У.Грынько

ЗАЦВЕРДЖАНА
распараджэннем прарэктара
па навуковай працы
№ 149-Ахр ад «25» 03 2025 г.

**Склад арганізацыйнага камітэта**
**па правядзенні конкурсу эсэ**
**“Вялікая Айчынная вайна ў лёсе маёй сям’і”**

1. Грынько Мікалай Уладзіміравіч, дырэктар навуковай бібліятэкі – старшыня арганізацыйнага камітэта.
2. Карпінчык Ганна Мікалаеўна, бібліятэкар аддзела бібліятэчных інфармацыйных тэхналогій.
3. Мілашэвіч Аляксандра Лявонцьеўна, бібліятэкар 1 катэгорыі аддзела камплектавання, навуковай апрацоўкі фондаў і арганізацыі каталогаў.

Дырэктар навуковай бібліятэкі М.У.Грынько

ЗАЦВЕРДЖАНА
распараджэннем прарэктара
па навуковай працы
№ 149-АХР ад «25» 03 2025 г.

**Склад журы па правядзенні конкурсу эсэ**
**“Вялікая Айчынная вайна ў лёсе маёй сям’і”**

1. Тарасава Святлана Мікалаеўна, кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры беларускай філалогіі – старшыня журы.
2. Ганчарук Ганна Аляксандраўна, загадчык аддзела камплектавання, навуковай апрацоўкі фондаў і арганізацыі каталогаў.
3. Грынько Святлана Дзмітрыеўна, магістр педагагічных навук, старшы выкладчык кафедры прыродазнаўчых і філалагічных дысцыплін і методыкі іх выкладання.
4. Сівова Таццяна Віктараўна, кандыдат філалагічных навук, дацэнт, дацэнт кафедры журналістыкі.

Дырэктар навуковай бібліятэкі М.У.Грынько

**ЗАЯЎКА НА ЎДЗЕЛ У КОНКУРСЕ ЭСЭ**
**“ВЯЛІКАЯ АЙЧЫННАЯ ВАЙНА Ў ЛЁСЕ МАЁЙ СЯМ’І”**

| **Звесткі пра аўтара:** | |
|---|---|
| Прозвішча, імя, імя па бацьку (цалкам) | |
| Дата нараджэння (дд.мм.гггг.) | |
| Факультэт / каледж | |
| Курс | |
| Спецыяльнасць | |
| Тэлефон мабільны | |
| E-mail | |
| Назва конкурснай работы | |

З Палажэннем аб правядзенні конкурсу эсэ “Вялікая Айчынная вайна ў лёсе маёй сям’і” азнаёмлены і згодны.

Як аўтар, не пярэчу супраць размяшчэння конкурсных матэрыялаў на бязвыплатнай аснове ў сетцы Інтэрнэт, выкарыстання іх у тэле- і радыёперадачах і на вонкавых рэкламных носьбітах на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, а таксама публікацый у друкаваных сродках масавай інфармацыі, у тым ліку прысвечаных Конкурсу, у некамерцыйных мэтах.

У адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь ад 7 мая 2021 г. № 99-З «О защите персональных данных» даю згоду на працягу 5 гадоў выкарыстоўваць мае вышэйпералічаныя персанальныя дадзеныя для складання спісаў удзельнікаў Конкурсу, апублікавання спісаў на сайце, стварэння і адпраўкі ўзнагародных дакументаў Конкурсу, рассылання конкурсных матэрыялаў, выкарыстання ў друкаваных прэзентацыйных/метадычных матэрыялах Конкурсу, прадастаўлення ў дзяржаўныя органы ўлады, для разліку статыстыкі ўдзелу ў Конкурсе.

Подпіс канкурсанта

Дата падачы заяўкі «__» _________2025

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Прарэктар
____________ М.І.Войтка
«___»________ 2025 г.

Каштарыс
на арганізацыю і правядзенне конкурсу эсэ
“Вялікая Айчынная вайна ў лёсе маёй сям’і”

| № п/п | Назва расходаў | Колькасць | Кошт (руб.) | Сума (руб.) | Крыніца фінансавання |
|---|---|---|---|---|---|
| 1. | Сертыфікаты ўдзельнікам | 25 | 1,00 | 25,00 | Пазабюджэтныя сродкі ўніверсітэта (перавышэнне даходаў над выдаткамі) |
| 2. | Дыпломы пераможцам | 3 | 1,00 | 3,00 | |
| 3. | Сувенірная прадукцыя | 25 | 5,00 | 125,00 | |
| 4. | Падарункі пераможцам | 3 | 32,00 | 96,00 | |
| **УСЯГО:** | | | | **249,00** | |

Галоўны бухгалтар — В.С.Гацук

Начальнік
планава-эканамічнага аддзела — І.П.Бябко

Дырэктар навуковай бібліятэкі — М.У.Грынько

Сяўко 8 (0152) 73 19 83